# МУЗЕЙНА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК СРОДАК РЭАЛІЗАЦЫІ КАМПЕТЭНТНАСНАГА ПАДЫХОДУ

***С. Д. Грынько***

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Э. Ажэшкі, 22, 230023, г. Гродна, Рэспубліка Беларусь,*
*s.grinko@inbox.ru*

Прэярытэтнай задачай у педагагічным працэсе пры рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу з’яўляецца развіццё індывідуальнасці навучэнца, яго сацыялізацыя, самавызначэнне ў грамадстве. Выкарыстанне музейна-педагагічнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры садзейнічае спасціжэнню школьнікамі сваёй уласнай сутнасці праз вывучэнне твораў нацыянальнага мастацтва, этнічнай культуры, што з’яўляецца асновай для самапазнання і самаактуалізацыі іх у соцыуме.

***Ключавыя словы:*** кампетэнтнасны падыход; музейна-педагагічная дзейнасць; музейная педагогіка; беларуская літаратура.

Працэс выхавання маладога пакалення ў XXI стагоддзі набывае асаблівую важнасць, зыходзячы з рэалій сучаснага грамадства: наступствы глабалізацыі і інфарматызацыі ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, тэхнічны прагрэс і пагаршэнне экалагічнай сітуацыі на планеце. У эпоху хуткасных сацыяльна-эканамічных змен актуальнай для падрыхтоўкі навучэнскай моладзі да жыцця ў грамадстве з’яўляецца арыентацыя іх на агульначалавечыя каштоўнасці, заахвочванне да сацыяльна значымай і творчай працы.

Музей – інстытут соцыуму, які выконвае ролю захавальніка каштоўнасцей, назапашаных чалавецтвам, што напамінаюць грамадзянам аб іх гістарычных каранях і нацыянальным багацці. Ва ўмовах рынкавых адносін, канкурэнцыі, росту спажывецкіх інтарэсаў, калі абвастраецца недахоп гуманнасці, спагады, дабрыні, маральнасці людзей, музей выступае той інстанцыяй, якая здольна скіраваць чалавека да найлепшых узораў яго дзейнасці, да культурных здабыткаў. Для гэтай установы, па словах рускага філосафа М. Ф. Фёдарава, не існуе таго, што «ўваскрасіць і ажывіць немагчыма», таму музей можа і павінен «вяртаць жыццё» [9, с. 10].

Адукацыйная дзейнасць «храма музаў» (грэч. museion, літаральна храм музаў) вывучаецца асобнай галіной ведаў – музейнай педагогікай, якая даследуе гісторыю, асаблівасці культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, метады ўздзеяння іх на розныя катэгорыі наведвальнікаў, узаемадзеянне з адукацыйнымі ўстановамі [3]. Даследчык А. Г. Ванслава падкрэслівае важнасць эмацыянальнага ўплыву сродкаў «храма музаў» на наведвальнікаў, адзначаючы, што ўвесь свет можна разглядаць як музей. Згодна яе меркаванню, музейная педагогіка – перш за ўсё методыка і

тэхналогія работы з людзьмі, з іх свядомасцю, з дапамогай музейных сродкаў [2, с. 25]. Б. А. Сталяроў вызначае музейную педагогіку як «галіну навукова-практычнай дзейнасці сучаснага музея, арыентаваную на перадачу культурнага вопыту праз педагагічны працэс ва ўмовах музейнага асяроддзя», якое ў адрозненні ад школьнага з'яўляецца ўнікальным, бо ў музеі сама атмасфера «валодае эстэтычнай аўрай, мастацкім і творчым зместам, а значыць – магутным духоўным патэнцыялам» [6, с. 106].

У Беларусі музейная педагогіка развіваецца ў рэчышчы асветніцкай і адукацыйнай дзейнасці музеяў розных профіляў. Праграмы гэтых устаноў змяшчаюць шэраг форм працы з аўдыторыяй, якія ўключаюць як традыцыйныя, так і шматлікія інтэрактыўныя метады ўзаемадзеяння з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў, найбольш з дзіцячай і юнацкай аўдыторыяй.

Значэнне музейна-педагагічнай дзейнасці для адукацыйнага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь падкрэсліваецца ў «Праграме бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі на 2016–2020 гады». У канцэптуальна-праграмным дакуменце вызначаны шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на фарміраванне грамадзянскасці і патрыятызму ў выхаванцаў устаноў адукацыі. Сярод найбольш важных з іх называецца выкарыстанне сродкаў музейнай педагогікі, што ўключае развіццё сеткі школьных музеяў, арганізацыю даследчай працы на іх базе, папаўненне экспазіцыі гэтых устаноў, правядзенне конкурсу віртуальных музеяў [5]. Важнасць выкарыстання адукацыйнай дзейнасці музея ў педагагічным працэсе вынікае са спецыфікі ўплыву гэтай установы на светапогляд асобы шляхам пагружэння яе ў спецыяльна арганізаванае прадметна-прасторавае асяроддзе, якое змяшчае ў сабе творы мастацтва і помнікі прыроды, экзатычныя прадметы і гістарычныя рэліквіі [8, с. 23].

На сучасным этапе развіцця сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі выкарыстанне музейна-педагагічнай дзейнасці на ўроках беларускай літаратуры дазваляе далучыць навучэнца да духоўнай культуры, што дазволіць асобе лепш зразумець сваю прыродную сутнасць праз спасціжэнне эстэтычнага ідэалу, створанага чалавецтвам. Літаратура як мастацтва слова з'яўляецца «дзейсным сродкам маральнага выхавання асобы з багатым духоўным светам, гуманістычным поглядам на рэчаіснасць, далучанай да беларускай культуры і іншых народаў свету, з жывым крытычным мысленнем, выразна сфарміраванымі жыццёвымі інтарэсамі і каштоўнасцямі» [7, с. 52]. Літаратура – неад'емная частка грамадства. Менавіта ў ёй засяроджаны сацыяльны, гістарычны і асабісты вопыт у спасціжэнні свету. Дзякуючы літаратуры чалавек падтрымлівае сувязь з папярэднімі пакаленнямі, мае магчымасць пераймаць іх каштоўнасці і лепш разумець структуру светабудовы.

Трэба адзначыць, што асоба, пазнаючы праз розныя віды мастацтва (у тым ліку і літаратуру) уласную сутнасць, дадзеную ёй ад нараджэння, пачынае лепш разумець менталітэт свайго народа, нацыянальны характар, які абумоўлівае паводзіны чалавека. Таму вельмі важна, на наш погляд, далучаць навучэнца да этнічнай культуры, якая з'яўляецца падмуркам да самаадукацыі і рэалізацыі сябе ў грамадстве.

На сённяшні дзень кампетэнтнасны падыход выступае прыярытэтным напрамкам працэсу адукацыі, які рэалізуе задачы дэсацыялізацыі асобы на аснове яе самапазнання і самаактуалізацыі, і адначасова з'яўляецца канцэптуальнай асновай для рэалізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці пры засваенні зместу вучэбных дысцыплін.

У навуковай літаратуры кампетэнтнасны падыход разглядаецца як «арыентацыя адукацыі на яе выніку: фарміраванне неабходных агульнакультурных і прафесійных кампетэнцый, самавызначэнне, сацыялізацыю, развіццё індывідуальнасці і самаактуалізацыю» [8, с. 7].

На думку С. Л. Траянскай, вельмі важна пры засваенні гуманітарных ведаў абапірацца на пачуццёвае ўспрыманне інфармацыі: эмпатыю, інтуітыўна-эмацыйнае пранікненне ў сакральны сэнс, які не можа быць дасягальны для звычайных рацыянальных шляхоў навуковага пазнання [8, с. 12]. На наш погляд, выкарыстанне адукацыйных магчымасцей музея пры вывучэнні беларускай літаратуры забяспечвае «пагружэнне» асобы ў каштоўнасную сутнасць матэрыялу за кошт візуалізацыі, эстэтычнага і культурнага ўздзеяння музейнага асяроддзя. Такім чынам ствараюцца ўмовы для лепшага разумення сэнсу, зместу, ідэйнай сутнасці вывучаных твораў. У гэтай сувязі на ўроках беларускай літаратуры пры арганізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці мэтазгодны зварот да такіх метадаў навучання, як метад творчага чытання, эўрыстычны, даследчы, рэпрадуктыўны метад [1, с. 19–20]. Акрамя таго, наладжванне адукацыйнага працэсу сумесна з музеем можа быць забяспечана пры наступных умовах:

- кожнае наведванне музея мае канкрэтную адукацыйную мэту;
- настаўнік і навучэнцы павінны ўсвядоміць, што наведванне музея не забаўка, а сур'ёзная праца, а таму трэба да яе рыхтавацца;
- арганізоўваць супрацоўніцтва з музеем трэба пасля папярэдняй падрыхтоўкі і ў працэсе школьных заняткаў, калі навучэнцы не стаміліся і гатовыя да ўспрымання;
- варта адмовіцца ад аглядных экскурсій як складанай формы працы як для школьнікаў, так і для дарослых;
- адбіраць экспанаты для экскурсійнага паказу трэба з улікам узроставых інтарэсаў навучэнцаў;
- вынікам музейна-педагагічнай дзейнасці становіцца творчасць школьнікаў (малюнак, сачыненне на тэму ўбачанага, стварэнне мадэляў і г. д.) [6, с. 28].

Зыходзяч ы з асноўных палажэнняў кампетэнтнаснага падыходу намі распрацавана сістэма заданняў па рэалізацыі музейна-педагагічнай дзейнасці пры навучанні беларускай літаратуры (схема № 1 і № 2).

*Схема 1: Асноўныя віды вучэбнай дзейнасці*

| АСНОЎНЫЯ ВІДЫ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ | | | |
|---|---|---|---|
| **Метад творчанга чытання** | **Рэпрадуктыўны метад** | **Эўрыстычны метад** | **Даследчы метад** |
| чытанне | складанне планаў | канструяванне вучнёўскага мэтавызначэння | самастойны аналіз матэрыялу |
| ілюстраванне | састаўленне сінхранічных табліц | фармуляванне эўрыстычных пытанняў | супастаўленне |
| пераказы | падрыхтоўка вусных адказаў | пастаноўка і вырашэнне праблем |назіранне |
| водгукі | слуханне | рэфлексія | падрыхтоўка рэфератаў |

*Схема 2: Тыпы заданняў*

| ТЫПЫ ЗАДАННЯЎ | | | |
|---|---|---|---|
| **Метад творчанга чытання** | **Рэпрадуктыўны метад** | **Эўрыстычны метад** | **Даследчы метад** |
| чытанне вершаў, звязаных з экспазіцыяй музея; | апрацоўка інфармацыі, атрыманай у музеі; | напісанне розных відаў творчых прац на аснове музейнай экспазіцыі пасля наведвання; | вывучэнне гісторыі жыцця пісьменніка і стварэнне віртуальнага музея; |
| ілюстраванне лёсу асобы, падзеі праз чытанне верша на матэрыяле музейнай экспазіцыі; | выкарыстанне інфармацыі з сайтаў музеяў; | выкананне творчых заданняў на матэрыяле сайта музея: буклет, рэклама, афіша і інш.; | вывучэнне гісторыі сваёй сям'і, роду і стварэнне музея сям'і; |
| пераказ убачанага ў музеі і выразнае чытанне верша, якое адпавядае музейнаму асяроддзю | агляд віртуальных тураў па музеі | стварэнне віртуальнага музея асобы галоўнага героя твора, мясцовасці яго жыхарства на матэрыяле вучэбнага дапаможніка, дадатковай літаратуры, | напісанне навукова-даследчых прац на аснове музейных матэрыялаў |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | вучэбнага кантэнту ў электронным адукацыйным рэсурсе (http://e-vedy.adu.by/) | |

Такім чынам, музейна-педагагічная дзейнасць на ўроках беларускай літаратуры разглядаецца з пазіцый кампетэнтнаснага падыходу і заключаецца ў стварэнні ўмоў для фарміравання ў навучэнцаў сацыяльнага вопыту за кошт далучэння асобы да духоўнай культуры свайго народа і чалавецтва. Уключэнне адукацыйных сродкаў музея ў працэс навучання літаратуры ўяўляецца магчымым, што ў сваю чаргу спрыяе наладжванню культурна-гістарычнага дыялогу, укараненню новых метадаў і форм работы па фарміраванні ў падрастаючага пакалення кампетэнцый, неабходных ім для паўнавартаснага жыцця ў высокатэхналагічным і хутказменным свеце.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. Беларуская літаратура ў школьным выкладанні: вучэбна-метадычны дапаможнік / А. В. Руцкая, М. У. Грынько, М. Г. Бубешка. Гродна : Выд-ва УА «Гродзенскі ДАІПК і ПКР і СА», 2006. 106 с.
2. *Ванслова Е. Г.* Музейная педагогика в XXI веке // Мир музея. 2005. № 3. С. 25–27.
3. Музейная педагогика [Электронный ресурс] // Педагогический терминологический словарь. URL: http://pedagogical_dictionary.academic.ru (дата обращения: 12.03.2019).
4. *Праскаловіч В. У.* Канцэпцыя вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура» (V–XI класы ). Праект / В. У. Праскаловіч, І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Роднае слова. 2016. № 3. С. 51–60.
5. Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2016–2020 гг. // Минский городской методический портал [Электронный ресурс]. URL: http://mp.minsk.edu.by/main (дата обращения: 22.02.2019).
6. *Столяров Б. А.* Музейная педагогика. История, теория, практика: учеб. пособие. М. : Высш. шк., 2004. 216 с.
7. *Троянская С. Л.* Основы компетентностного подхода в высшем образовании: учеб. пособие. Ижевск : Издательский центр «Удмуртский университет», 2016. 176 с.
8. *Троянская С. Л.* Музейная педагогика и ее образовательные возможности в развитии общекультурной компетентности: учеб. пособие [Электронный ресурс] // С. Л. Троянская. Ижевск: Ассоциация «Научная книга», 2007. URL: http://elibrary.udsu.ru/xmlui (дата обращения: 12.08.2019).
9. *Фёдоров Н. Ф.* Музей, его смысл и назначение // Музейное дело и охрана памятников. М.: Российская государственная библиотека, 1992. 60 с.